В.М. Саўчанка (Беларусь, Магілёў)

# ПЕРЫЯД ЯК ГРАМАТЫКА-СТЫЛІСТЫЧНЫ СРОДАК У ТВОРЧАСЦІ МАКСІМА ТАНКА

Перыяд з'яўляецца важным стылістычным сродкам у паэзіі Максіма Танка. Свет танкаўскай творчасці цікавы, разнастайны, вельмі своеасаблівы, самабытны. Яго вершы насычаны і шчырым патрыятызмам, і развагай над вечнымі жыццёвымі праблемамі, і роздумам пра тое, што робіць чалавека Чалавекам, і пяшчотай да родных яму людзей. Тэмы "вечныя", якім прысвяціла свае творы не адно пакаленне мастакоў, пісьменнікаў, паэтаў, набываюць пад яго пяром новае, непаўторнае гучанне, прымушаюць яшчэ раз падумаць пра сэнс жыцця, пра важнасць чалавечых пачуццяў і ўчынкаў.Адзначанае можна ўбачыць асабліва ў тых вершах, дзе выкарыстаны перыяд, які структурна распадаецца на дзве часткі. Павышэнне напружання пры пераходзе ад адной часткі перыяду да другой аказвае эмацыянальнае ўздзеянне на чытача, дапамагае пераканаць яго ў справядлівасці аўтарскіх разважанняў.

Кій,
На які ў жыцці не абапрэшся,
Нож,
Якім хлеба сябрам не адкроіш,
Кубак,
З якога вады не нап'ешся,
Соль,
Якой гутарку, смех не падсоліш,
Дружба,
Не зведаўшая ліхалецця,
Слава
Без працы мазольнай, упартай,
Слова,
Якое не грэе, не свеціць,--
Нічога не варты.

М. Танк выбірае ў многіх сваіх вершах перыяд у якасці вобразнага сродку таму, што ён дапамагае паэту найбольш удала дасягнуць мэты сваёй творчасці. Танкаўскі перыяд – то вобразная замалёўка, то самабытная карціна, то разгорнутае разважанне, насычанае складаным і глыбокім зместам [5, 204]. Менавіта перыяд у большасці выпадкаў дапамагае паэту стварыць

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

шматзначнасць, падтэкст, што прымушае вяртацца да яго твораў, бо першае ўспрыняцце вершаў Танка не заўсёды адзіна магчымае, кожнае наступнае прачытанне можа ўнесці пэўны дадатковы сэнс, выявіць думку, не заўважаную раней. Выразнае падтэкставае маўленне характэрна для многіх твораў М. Танка, і ў значнай ступені для тых, дзе ў якасці вобразнага сродку аўтар выбірае перыяд.

Структура танкаўскага перыяду ў большасці выпадкаў традыцыйная: дзве часткі, адна з якіх (часцей – першая) вымаўляецца з паступовым узрастаннем, другая – з выразным паніжэннем голасу. Паміж гэтымі часткамі – прыкметная паўза:

З легендаў і казак былых пакаленняў,
З калосся цяжкога жытоў і пшаніц
З сузор'яў і сонечных цёплых праменняў,
З грымучага ззяння бурлівых крыніц,
З птушынага шчэбету, шуму дубровы,
І з гора, і з радасці, і з усяго
Таго, што лягло назаўсёды ў аснову
Святыні народа, бяссмерця яго, –
Ты выткана, дзіўная родная мова.

Няцяжка заўважыць, што звычайна аб'ём першай часткі перыяду значна большы, чым другой, і гэта апраўдана: менавіта першая частка ўтрымлівае ў сабе своеасаблівы падрабязны пералік фактаў, заўваг, падзей, думак, перажыванняў, здольных эмацыянальна ўздзейнічаць на чытача і тым самым непрыкметна пераканаць яго ў тым, аб чым будзе ісці гаворка ў выніку (другой частцы перыяду). Нават калі і не пераканаць, але прымусіць задумацца ці прызнаць слушнай аўтарскую думку.

Сустракаецца ў творчасці М. Танка і перыяд з некалькі іншымі суадносінамі аб'ёмаў першай і другой частак. Бывае, другая частка (вынік, прычына ці інш.) таксама з'яўляецца разгорнутай: аўтар не проста прапаноўвае ў якасці абагульнення сваю думку, а нібы запрашае чытача паразважаць над праблемай разам ("І чаго", "Вернасць" і інш.).

Ёсць у М. Танка вершы, якія немагчыма ўціснуць у рамкі разгледжаных дзвюх частак (хоць, паводле Д. Э. Разенталя, трэба ўсё ж такі адзначыць, што мова такога перыяду набліжаецца да перарывістай [1, 370]):

Відаць, той,
Хто вычараваў яе з мармуру,
Паабяцаў быў
Да яе вярнуцца.
Бясконцыя дні, месяцы,
Гады
Яна яго чакае.

I частка

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Нат калі надрываліся
Гудкі паветранай трывогі
І ўсе хаваліся ў траншэі,
Бамбасховішчы –
Яна заставалася на месцы.
І калі многія
З агнём ахопленага горада
Эвакуіраваліся,
Яна не пабегла на вакзал.
І нат калі ворагі
Крычалі “Хэндэ хох!”
І аўтаматная чарга
Свінцом ёй апаліла грудзі –
Яна не падняла сваіх рук.

II частка

Цікава, хто паклаў
Ля статуі
Параненай багіні
Ружу?

III частка

“Вернасць”

Як бачна, у працытаваным творы можна выдзеліць тры часткі. Першая – уступ да твора, аднак аўтар пакуль што адкрыта не выказвае, пра што будзе распавядаць, якую праблему будзе ўздымаць у творы. Нібы мімаходам, засяродзіўшы ўвагу на некаторых акалічнасцях (істотных ці неістотных – вырашаць ужо потым чытачу), паэт запрашае чытаць далей, бо менавіта там і раскрываецца асноўная думка верша. Другая частка – некалькі складаных сказаў, аб’яднаных адной тэмай, сказаў, якія характарызуюцца з боку зместу значнай паўнатой і завершанасцю думкі, адзінствам тэмы, узрастальнай сілай напружання. Пасля другой часткі – выразная паўза. І затым трэцяя частка – своеасаблівае заключэнне да сказанага як запрашэнне паразважаць разам з аўтарам над закранутай ім праблемай. Дарэчы, такое заключэнне-разважанне характэрна і для іншых вершаў М. Танка, асноўным вобразным сродкам якіх з’яўляецца перыяд.

Варта зазначыць, што мову другой, трэцяй, чацвёртай строф (другой часткі) гэтага верша таксама можна разглядаць у якасці перыядычнай, бо ў іх прыкметна

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

размяжоўваюцца два структурныя кампаненты. Такім чынам, атрымліваецца спецыфічная канструкцыя – “перыяд у перыядзе”.

Шматлікія лінгвістычныя слоўнікі тлумачаць перыяд як моцна развіты просты сказ ці мнагачленны складаны сказ[2, 279], [3, 100-101], [4, 268]. Відаць, усё ж такі правільней зрабіць агаворку: “… моцна развіты просты сказ, мнагачленны складаны сказ ці некалькі сказаў, аб’яднаных адной тэмай…” Бо, як ужо вынікае з некаторых прааналізаваных вершаў, перыяд не заўсёды можна абмежаваць адным сказам, нават моцна развітым складаным сказам.

Такім чынам, перыяд з’яўляецца важным граматыка-стылістычным сродкам у творчасці М. Танка. Прычым нават гэты сродак паэт выкарыстоўвае не стэрэатыпна, а па-мастацку, шукаючы новыя формы, варыянты, мяняючы суадносіны паміж структурнымі элементамі, удала спалучаючы з іншымі вобразнымі сродкамі. І дзякуючы гэтаму танкаўскія вершы, у якіх аўтар выкарыстоўвае перыяд, не толькі эмацыянальна ўздзейнічаць на чытача, пераконваюць у справядлівасці аўтарскіх сцвярджэнняў, але і прымушаюць разважаць над вечнымі жыццёвымі праблемамі (дабра і зла, любві і нянавісці, вернасці, месца чалавека ў свеце, прызначэння паэзіі, сэнсу жыцця), тэмамі, якія пад пяром паэта набываюць новае, непаўторнае гучанне.

Літаратура


1. Розенталь Д. Э. Практическая стилистика русского языка. – М.,1987.
2. Розенталь Д.Э., Теленкова М.А. Словарь-справочник лингвистических терминов. – М., 1976.
3. Сцяцко П. У., Гуліцкі М. Ф., Антанюк Л. А. Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў.—Мн.,1990.
4. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: У 5 т. – Мн., 1984—1987.—
Т. 4.
5. Юрэвіч А. К. Стылістыка беларускай мовы. – Мн., 1992.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова